Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»
Исторический факультет

# БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННОСТЬ: ИСТОКИ, СТАНОВЛЕНИЕ, РАЗВИТИЕ (IX–XXI вв.)

Материалы
Республиканской научно-теоретической конференции

Минск, 29 июня 2017 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Минск
РИВШ
2017

УДК 323(476)(091)(082)
ББК 66.3(4Беи)я43
Б43

Р е к о м е н д о в а н о

советом исторического факультета
УО «Белорусский государственный педагогический
университет имени Максима Танка»
(протокол № 10 от 24 мая 2017 г.)

Р е д а к ц и о н н а я  к о л л е г и я :
кандидат исторических наук доцент *А. В. Касович* (отв. ред.);
кандидат исторических наук доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат исторических наук доцент *А. А. Корзюк;*
кандидат исторических наук доцент *А. Ф. Великий*

Р е ц е н з е н т ы :
доктор исторических наук профессор *А. М. Лютый;*
доктор исторических наук профессор *И. В. Варивончик*

Б43 **Белорусская** государственность: истоки, становление, развитие (IX–XXI вв.) : материалы Респ. науч.-теорет. конф., Минск, 29 июня 2017 г. / редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2017. – 232 с.
ISBN 978-985-586-041-0.

В сборнике представлены актуальные материалы исследований, посвященные проблемам белорусской государственности в историческом, социально-культурном и геополитическом аспектах.

Адресуется преподавателям, аспирантам и студентам вузов.

**УДК 323(476)(091)(082)**
**ББК 66.3(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-586-041-0**

© Оформление. ГУО «Республиканский институт высшей школы», 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

начальник Виленского охранного отделения Е.К. Климович докладывал директору Департамента полиции Н.П. Гарину об агитационной деятельности организации «Бунд» и «Искра» [6, л.1-4]. Согласно Инструкции и Положению о районных охранных отделениях Е.К. Климович должен был установить постоянное агентурное наблюдение и на каждую организацию должен вести дневник наружного наблюдения, дневник агентурного наблюдения, фотографический архив, библиотеку нелегальной литературы данных организаций.

На все эти мероприятия ежегодно тратились огромные суммы денег, а работа районных охранных отделений была малоэффективной, главная задача их по созданию центральной агентуры так и не была выполнена. Поэтому в феврале 1914 г. Северо-Западное районное охранное отделение было упразднено, а функции политической полиции снова перешли к Главному жандармскому управлению.

Таким образом, политическая полиция Беларуси в 1880–1914 г. представляла собой сложную многоуровневую и разнородную по своему составу систему, каждый элемент которой выполнял определенную функцию. Тем не менее, эффективность действий политической полиции была прямо пропорциональна сложности системы управления. В связи, с чем проходили периодические структурные реформы внутри системы во время всего изучаемого периода.

**Литература**

1. Краткий систематический свод действующих законоположений и циркулярных распоряжений, относящихся до обязанностей чинов Губернских Жандармских Управлений по наблюдению за местным населением и производству дознаний / Сост. полк. Добряков. – СПб. : Тип. отд. корп. жанд., 1903. – 650 с.

2. Перегудова, З.И. Политический сыск России (1880–1917 гг.) / З.И. Перегудова. – М. : РОССПЭН, 2000. – 432 с.

3. Агентурная работа политической полиции Российской империи : сб. док. 1880–1917 / сост. Е.И. Щербакова. – М. ; СПб. : Дмитрий Буланин, 2006. – 382 с.

4. Телеграммы от наших корреспондентов // Русское слово. – 1907 г. – № 11. – 8 с.

5. Телеграммы от наших корреспондентов // Русское слово. – 1907 г. – № 17. – 8 с.

7. Государственный архив Российской Федерации (ГАРФ). – Ф.102. – Оп. 262. – Д.16. – Положение о районных охранных отделениях, 1906 г. – Л. 1-4.

## ДВАРАНСКА-ПАМЕШЧЫЦКАЯ АВЕЧКАГАДОЎЛЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

***Гагоўкія Н.[illegible], Коцел Г.А., 3 курс, гістарычны факультэт, БДПУ, Мінск***
***навук. кір. – ЖыткоА.П., доктар гістарычных навук, прафесар, БДПУ***

У парэформенны перыяд памешчыкі вымушаны былі займацца жывёлагадоўляй. Гэта было выклікана эканамічнай неабходнасцю. Земляробства патрабавала арганічных і мінеральных угнаенняў. Коні выкарыстоўваліся ў якасці цяглавай сілы. Буйная рагатая жывёла давала мяса, малочныя прадукты, угнаенне.

Немалаважнае значэнне ў жывёлагадоўлі Беларусі займала авечкагадоўля. На тэрыторыі краю разводзіліся мерыносавыя авечкі ў дваран-памешчыкаў, за выключэннем Слонімскага павета, дзе ў сялян іх было 520 галоў [1, с. 108], а таксама непародзістыя, грубашэрсныя як у сялянскіх, так і памешчыцкіх гаспадарках.

У Беларусі сялянская грубашэрсная авечкагадоўля пераважна насіла спажывецкі характар. Яна задавальняла патрэбы сялян у прадуктах харчавання, сыравіне для адзення. Памешчыцкая грубашэрсная і асабліва танкарунная авечкагадоўля была гандлёва-прадпрымальніцкай галіной гаспадаркі.

Табліца

Дынаміка колькасці авечак у 5 заходніх губернях (тыс. штук)[8, с.167]

| | Губерні | | |
|---|---|---|---|
| | Віленская | Віцебская | Гродзенская |



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | груба-шэрсныя | мерыно-савыя | разам | груба-шэрсныя | мерыно-савыя | разам | груба-шэрсныя | мерыно-савыя | разам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1856 | 168,4 | 38,6 | 207,0 | 172,2 | 0,8 | 173,0 | 234,0 | 168,9 | 402,9 |
| 1864 | 180,0 | 40,0 | 220,0 | 280,0 | | 280,0 | 332,0 | 220,0 | 552,0 |
| 1870 | 215,5 | 11.0 | 226,5 | 288,2 | 2,2 | 290,4 | 378,6 | 126,3 | 504,9 |
| 1880* | 287,4 | 6,6 | 293,0 | 268,7 | 1,4 | 270,1 | 436,9 | 126,9 | 563,8 |
| 1910** | 362,6 | 7,6 | 370,2 | 402,1 | 9,7 | 411,8 | 540,9 | 73,1 | 614,0 |
| 1911 | 396,1 | 6,3 | 402,4 | 398,4 | 10,2 | 408,6 | 532,1 | 73,7 | 605,8 |

| | Губерні | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Мінская | | | Магілёўская | | | Разам | | |
| | груба-шэрсныя | мерыно-савыя | разам | груба-шэрсныя | мерыно-савыя | разам | груба-шэрсныя | мерыно-савыя | разам |
| 1856 | 233,1 | 38,5 | 392,6 | 290,2 | — | 290,2 | 1117,[illegible] | 347,8 | 1465,7 |
| 1864 | 320,0 | 55,0 | 475,0 | 344,0 | 24,0 | 37[illegible],0 | 1456,0 | 449,0 | 1905,0 |
| 1870 | 365,6 | 96,6 | 462,2 | 319,2 | 8,2 | 327,4 | 1567,1 | 244,3 | 1811,4 |
| 1880* | 473,0 | 74,0 | 547,0 | 353,9 | 5,1 | 359,0 | 1819,9 | 214,0 | 2033,9 |
| 1910** | 763,7 | 27,6 | 791,3 | 442,6 | 0,3 | 442,[illegible] | 2511,6 | 118,3 | 2629,9 |
| 1911 | 687,2 | 12,5 | 699,7 | 446,2 | 0,4 | 446,6 | 2460,0 | 103,1 | 2563,1 |

Аб дынаміцы развіцця авечкагадоўлі ў Заходнім краі сведчаць даныя табліцы. З 1856 па 1911 г. колькасць авечак павялічылася з 1465,7 тыс. да 2563,1 тыс. галоў, альбо ў 1,7 разы. Найбольшы прырост адбыўся ў Віцебскай губ., а найменшы — у Гродзенскай і Магілёўскай губернях (у 1,5 разы). Гэта тлумачыцца тым, што ў 1856 г. у Віцебскай губ. зафіксаваны мінімальны лік авечак у параўнанні з іншымі.

З табліцы відаць, што развіццё авечкагадоўлі адбывалася хвалепадобна. Звяртае на сябе ўвагу скарачэнне колькасці авечак у перыяд з 1864 па 1870 г. Яно склала 93,6 тыс. галоў. Пры гэтым значна паменшыўся мерыносавы статак. Хаця колькасць грубашэрсных авечак павялічылася, але тэмпы прыросту былі нязначнымі. Прычыну такой з’явы В. П. Панюціч звязвае з вынікамі рэформы 1861 г. Зразумела, што цяжкасці перабудовы памешчыцкай гаспадаркі ў новых умовах аказалі негатыўны ўплыў на яе развіццё і патрабавалі ад дваран пэўных выдаткаў. Але, як нам здаецца, больш правільныя высновы зрабіла Валуеўская камісія. Яна ў 1872 г. прама адзначыла, што “авечкагадоўля... пасля 1863 г. стала мізэрнай. Авечкі, як і іншая жывёла, пайшлі пад нож для выплаты першага кантрыбуцыйнага збору з памешчыцкіх маёнткаў”[2, с. 128]. Уласнікамі ж мерыносаў былі выключна дваране-памешчыкі. Калі за гэтыя гады статак танкарунных авечак зменшыўся амаль у два разы, то, відаць, у першую чаргу на продаж ішлі грубашэрсныя авечкі і ўжо, у крайнім выпадку,– мерыносавыя.

Сяляне ж кантрыбуцыі не плацілі. Таму можна меркаваць, што колькасць грубашэрсных памешчыцкіх авечак зменшылася больш значна, чым танкарунных. Іх нязначнае агульнае павелічэнне адбылося за кошт сялянскіх. На жаль, гэта толькі меркаванне, таму што афіцыйная статыстыка да 1878 г. не падзяляла авечак на ўласніцкія і сялянскія.

У наступныя гады прырост адбываўся толькі за кошт грубашэрсных парод. Праўда, акрамя мерыносавых і простых авечак, некаторыя ўласнікі разводзілі і мясную пароду. Але

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

апошнія сустракаліся вельмі рэдка. Звычайна гэта былі метысы мясных авечак з мерыносавымі. Статкі іх былі невялікімі і складаліся звычайна з 50—100 галоў. Чыстакроўныя мясныя авечкі былі зафіксаваны ў 3 маёнтках Мінскага павета — Крацяніца, Стары Свержань і Трусінава [1, с. 14, 18].

Грубашэрсныя авечкі былі распаўсюджаны амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Мерыносавая ж авечкагадоўля сустракалася нават не ва ўсіх паветах. Асноўным цэнтрам танкаруннай авечкагадоўлі былі 6 беларускіх паветаў Гродзенскай губ. У 1880 г. на іх долю прыпадала 76,2 % мерыносаў губерні і 52,8 % ад усяго статка сучаснай тэрыторыі Беларусі. Другое месца ў мерыносавай авечкагадоўлі займала Мінская губ. – 74,0 тыс. галоў, альбо 40,3 %. У беларускіх жа паветах Віленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў налічвалася толькі 12,7 тыс. мерыносаў, ці 6,9 % [1, с. 106-110].

У многіх уладальніцкіх маёнтках танкарунная авечкагадоўля была даволі буйной сельскагаспадарчай галіной. Звычайна ў іх утрымлівалася ад 300 да некалькі тысяч авечак. У другой палове XIX ст. статкі менш чым у 300 галоў сустракаліся вельмі рэдка, паколькі ў такіх выпадках значна ўзрасталі выдаткі на іх утрыманне. Па падліках В. [illegible] Панюціча, у першай палове 60-х гг. з 22 абследаваных эканомій Беларусі, дзе ўтрымлівалі мерыносаў, у 12 з іх налічвалася звыш 1 тыс. галоў, у 9 — ад 300 да 1 тыс. У канцы [illegible]0-х гг. з 25 уладальніцкіх мерыносагадоўчых гаспадарак краю ў 11 было звыш 1 тыс. авечак, у 12 – ад 300 да 1 тыс., і ў 2 — да 300[3, с. 101]. Найбольш вядомымі і буйнымі эканоміямі, дзе вырошчваліся мерыносавыя авечкі ў Беларусі, былі маёнткі Свіслач гр. Пуслоўскага Гродзенскага, Шчорсы гр. Храптовіча Навагрудскага, Парэчча Скірмунта Пінскага паветаў[4, с. 91-92]. Хаця гэтыя мерыносавыя “заводы” захаваліся і на пачатку XX ст., дзе роля танкаруннай авечкагадоўлі няўхільна паніжалася. Аб гэтым сведчыць як агульнае скарачэнне колькасці мерыносаў (з 449,0 тыс. у 1864 г. да 103,1 тыс. у 1911 г., ці ў 4,4 разы) (гл. табліцу), так і з’яўленне шэрагу маёнткаў, дзе іх утрымлівалася толькі да некалькіх дзесяткаў. Так, у 1912 г. у Дзісненскім павеце было 16 эканомій, дзе налічвалася 176 авечак (у сярэднім па 11 на эканомію), Лідскім — 4 эканоміі і 132 авечкі (па 38) і толькі ў Ашмянскім павеце Віленскай губ. у маёнтку Вішнёва гр. Храптовіча-Буцянёва статак мерыносаў складаўся з 1245 авечак [5, с. 19]. Да пачатку Першай сусветнай вайны колькасць танкарунных авечак пачала рэзка памяншацца. Калі ў 1911 г. у Гродзенскай губ. налічвалася 73,7 тыс. мерыносаў, то ўжо ў 1913 г.— толькі 22,2 тыс. У Мінскай губ. у 1913 г. – 6,3 тыс. супраць 27,6 тыс. у 1910 г. [6, с. 47; 7, с. 76] Адказ памешчыкаў ад гэтай галіны жывёлагадоўлі быў выкліканы эканамічнай немэтазгоднасцю. Па-першае, узмацнілася канкурэнцыя як на сусветным, так і на расійскім рынку на танкарунную воўну, а па-другое, буйнарагатая жывёлагадоўля з яе малочнай накіраванасцю і свінагадоўля сталі больш выгаднымі галінамі прыкладання капіталу.

У Беларусі ва ўласніцкіх гаспадарках пераважна разводзілі дробныя і сярэднія пароды танкарунных авечак – электраль-негрэці і негрэці-рамбулье. На працягу сезона можна было атрымаць па 1–1,5 кг воўны з авечкі. У 1861 г. у беларускіх паветах было атрымана 28 тыс. пуд. танкарунай воўны коштам звыш 500 тыс. руб., у 1901 г.– 8 тыс. пуд. на 150 тыс. руб. [3, с. 102]. На буйных авечкагадоўчых комплексах, дзе была наладжана якасная стрыжка і апрацоўка воўны, яе кошт быў вышэйшы за сярэдні. Так, памешчыкі Мінскага павета выручалі за пуд па 1[illegible]–18 руб. [8, с. 167], а воўна з маёнтка Вішнёва гр. Храптовіча-Буцянёва, дзе ў 1911 г. утрымлівалася 1710 мерыносаў, ішла па 20–28 руб. за пуд [9, с. 11–12; 7, с. 19].

Памешчыкі Беларусі разводзілі і простых, грубашэрсных, авечак, асабліва ў тых раёнах, дзе было шмат выганаў, забалочаных зямель. Гэта тычыцца Магілёўскай і беларускіх паветаў Віленскай і Віцебскай губерняў. Так, на рубяжы 70–80-х гг. у беларускіх паветах Віленскай губ. на долю памешчыкаў прыпадала 26,1 % грубашэрсных авечак, а ў Гродзенскай і Мінскай губернях адпаведна 13,5 і 3,3 % [1, с. 106, 110].

У 1900 г. прыватнікі 35 беларускіх паветаў утрымлівалі 19,8 % статка авечак і коз з агульнай колькасці 2533,4 тыс. галоў [8, с. 170].

Калі ўлічыць, што коз разводзілі ў асноўным сяляне і мяшчане, то ўключэнне коз у агульную лічбу істотна не сказваецца на канчатковых выніках. На жаль, у наступныя гады афіцыйная статыстыка не падзяляла авечак на сялянскія і прыватнаўласніцкія. Калі экстра-



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

паліраваць атрыманы працэнт за 1900 г. на 1911 г., то на долю памешчыкаў і іншых прыватнікаў 5 паўночна-заходніх губерняў прыходзілася 103,1 тыс. мерыносаў і 487,1 тыс. грубашэрсных авечак (гл. табліцу).

У Беларусі, як і ў Еўрапейскай частцы Расіі, у авечкагадоўлі наглядаліся адны і тыя ж працэсы. Абсалютная і адносная колькасць мерыносаў скарачалася, а грубашэрсных авечак павялічвалася. З 1864 па 1911 г. статак мерыносаў у 5 паўночна-заходніх губернях скараціўся ў 4,4 разы, а ў 50 губернях імперыі – у 8,2 разы (з 11655 тыс. да 2235 тыс.) [8, с. 171]. Агульнай прычынай скарачэння колькасці тонкарунных авечак як у Беларусі, так і ў Еўрапейскай частцы Расіі, з’явілася падзенне цэн на воўну ў сувязі з яе наплывам з Аўстраліі і Амерыкі. Разам з тым агульны абсалютны рост статка авечак не адлюстроўваў рэальнай карціны становішча дадзенай галіны жывёлагадоўлі як у Беларусі, так і ў імперыі ў цэлым. Так, рост пагалоўя авечак у парэформенныя гады адставаў ад росту насельніцтва. Калі ў 1856 г. у 5 паўночна-заходніх губернях на 100 жыхароў прыходзілася 33,9 авечкі, то ў 1911 г. – 23,9. Памяншэнне склала 21,1 %. У Еўрапейскай Расіі гэтыя паказчыкі знізіліся адпаведна з 72,0 да 34,5 авечкі, ці на 52,1 %. Калі ж улічыць, што ў Беларусі ў парэформенныя гады адбываўся дэмаграфічны выбух у асноўным за кошт пачатковага насельніцтва і шчыльнасць насельніцтва 5 беларускіх губерняў была ў 1,7 раза большай, чым у Еўрапейскай Расіі (32,3 чал. на кв. км у параўнанні з 19,3 чал. кв. км) [8, с. 171], то страты беларускай авечкагадоўлі ў разліку на колькасць жыхароў былі значна меншымі, чым у 50 губернях імперыі. Пры гэтым сялянская авечкагадоўля (за выключэннем іх заможнай часткі) заставалася спажывецкай, а дваранска-памешчыцкая станавілася больш гандлёва-прадпрымальніцкай.

**Літаратура**


1. Исследование современного состояния овцеводства в России. Вып. VI. Овцеводство в северо-западных и юго-западных губерниях. – СПб.: Тип. В. Ф. Киршбаума, 1885. – 111 с.

2. Доклад комиссии 1872 г. – СПб.: Тип. В. Ф. Киршбаума, 1875. – Отд. II. – 313 с.

3. Панюціч, В.П. Танкарунная авечкагадоўля ў памешчыцкай гаспадарцы Беларусі ў другой палове XIX ст. (1861-1900 гг.) / В.П.Панюціч // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1975. – № 6. – С. 96–112.

4. Памятная книжка Виленской губернии на 1895 год. – Вильно: Губерн. тип., 1894. – Ч. 2. – 150 с.

5. Обзор Виленской губернии за 1912 год. – Вильна: Губерн. тип., 1913. – 100 с.

6. Сборник статистико-экономических сведений по сельскому хозяйству России и иностранных государств. – СПб., 1913. – Вып. 6. – 600 с.

7. Памятная книжка Минской губернии на 1915 год. – Минск: Губерн. тип., 1914. – Отд. IV. – 185 с.

8. Жытко, А.П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг.: Манагр. / А.П.Жытко. – Мінск: БДПУ, 2003. – 233 с.

9. Памятная книжка Виленской губернии на 1913 год. – Вильно: Губерн. тип., 1913. – Ч. 2. – [illegible] с.


## МУЖСКИЕ ГИМНАЗИИ МОГИЛЕВСКОЙ ГУБЕРНИИ (1793-1917ГГ.)


***Гец В.И., 2 курс, исторический факультет, БГПУ, Минск***

***науч. рук. – Забавский Н.М., доктор исторических наук, профессор, БГПУ***


Особое место в политике Российской Империи занимало образование, среднее в частности. Среднее образование являлось механизмом для формирования пророссийской интеллигенции, а так же для подготовки учащихся к обучению в высших учебных заведениях. Первые гимназии в России открылись только во время правления Пётра I в Москве и Ревеле (Таллинне), позднее появились при Академии наук и открывающихся университетах. 26 января 1803г. император Александр I утвердил "предварительные правила народного просвещения", гимназии или губернские училища стали открываться в каждом губернском городе. Руководил ими губернский директор училищ [4, с. 80].



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ